7
1939

36

Инв. 1953 г. БА 663

СВЯЗАТЕЛЬНЫЙ
КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Работніца і калгасніца Беларусі

№ 15

БССР
імені
ЛЕНІНА

Вас. Лебедев-Кумач

ХАСАНСКИЕ ДНИ

Вся наша Родина сегодня
Хасанский вспоминает бой.
Гордясь победой прошлогодней,
Готовы к схватке мы любой.

Богатства наши умножая,
За сталинский сражаясь план,
Справляя праздник урожая,—
Мы не забыли про Хасан.

Мы знаем, что свободу нашу—
И мирный сон и вольный труд,
Заводы, фабрики и пашни—
Герои наши берегут.

Они сильны и не боятся
Ни пули, ни смертельных ран,
Они с врагами будут драться
Так, как у озера Хасан!

Давая наши сбереженья
Любимой Родине взаймы,
Исход грядущего сраженья
Своим рублем решаем мы.

Пусть будут всех сильней и краше
Войска рабочих и крестьян,
Чтоб на любой границе нашей
Враги увидели Хасан!

Растут и крепнут наши силы,
И авиация и флот.
В боях у нас не будет тыла—
Сражаться будет весь народ!

Готовы хоть сейчас к атаке
Бойцы прекраснейшей из стран.
Пускай хвастливые „вояки“
Не забывают про Хасан!

Пускай ни с юга, ни с востока
Кровавых рук не тянут к нам,—
Не то ударим мы жестоко
По обезьяньим их рукам!

Удар наш будет смел и страшен,
Мы налетим, как ураган,
И у чужих озер—не наших—
Мы им напомним про Хасан.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 15. ЖНІВЕНЬ 1939 г.

На вокладцы: Варашылаўскі коннік, жонка камандзіра РСЧА тав. Кісялёва на кані перамагае перашкоду.
Фота Палетаева Н.

ПРАМОВА таварыша МОЛАТАВА

ПРЫ АДКРЫЦЦІ ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ 1 ЖНІЎНЯ 1939 г.

Таварышы! Адкрыццё Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі з'яўляецца ўсенародным таржаством. У ім знаходзіць сваё адлюстраванне вялікая перамога калгаснага ладу, які канчаткова ачысціў совецкую зямлю ад кулакоў і іншых эксплаататараў, вызваліў шлях для пабеданоснага ўздыму сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і ўсёй нашай краіны.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка, пачын арганізацыі якой належаў Другому Ўсесаюзнаму З'езду калгаснікаўударнікаў у 1935 г.,— гэта, перш за ўсё, выстаўка калгасаў, выстаўка калгасных перамог, у якіх мы бачым усёперамагаючую сілу саюза рабочых і сялян пад сцягам комунізма **(апладысменты),** пад сцягам вялікай партыі Леніна—Сталіна. **(Бурныя апладысменты. Воклічы «ура!»).** У гэтым яе карэннае адрозненне ад сельскагаспадарчай выстаўкі 1923 года, калі ў нашай краіне панавала аднаасобная дробная сялянская гаспадарка, а калгасы і соўгасы былі яшчэ зусім слабыя і займалі малапрыкметнае месца.



Гэтая Сельскагаспадарчая выстаўка падводзіць вынік дзесяцігоддзю, у пачатку якога сялянскія масы канчаткова павярнулі ад дробнай аднаасобнай гаспадаркі да буйнай калгаснай гаспадаркі. Успомніце, таварышы, «год вялікага пералому»—1929 год, калі адбыўся гэты паварот сялянства на шлях калектывізацыі. Тады, дзесяць год таму назад, глеба для перабудовы сельскай гаспадаркі на аснове калгасаў была ўжо ва многім падрыхтавана. Совецкая ўлада ўмацавалася. Наша індустрыя пачала масавую выпрацоўку трактараў і машын для сельскай гаспадаркі. Барацьба з кулацтвам, асабліва ў часе хлебазагатовак 1928—1929 гг., разгарнулася па ўсяму фронту і ператварылася ў агульнае наступленне супроць капіталістычных элементаў. У вёсцы меўся ўжо вялікі вопыт сельскагаспадарчай каперацыі. Поспехі першых калгасаў і соўгасаў атрымалі вядомасць. Партыя і Урад правялі к гэтаму часу вялікую работу па раз'ясненню сялянам таго, што сапраўдны ўздым сельскай гаспадаркі і забеспячэнне гарадоў хлебам і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі магчымы толькі з пераходам сялян на шлях калгасаў, на шлях калектывізацыі аднаасобных гаспадарак. Тады адбыўся гістарычны паварот сялянства нашай краіны на шлях калгасаў. У сваім славутым артыкуле «Год вялікага пераломy» таварыш Сталін пісаў у канцы 1929 года:

«У калгасы пайшоў серадняк. У гэтым аснова таго карэннага пераломy ў развіцці сельскай гаспадаркі, які складае важнейшае дасягненне совецкай улады за прайшоўшы год...

Рушыцца і ператвараецца ў прах апошняя надзея капіталістаў усіх краін, якія мараць аб аднаўленні капіталізма ў СССР,— «свяшчэнны прынцып прыватнай уласнасці». Сяляне, разглядваемыя імі як матэрыял, які ўгнойвае глебу для капіталізма, масамі пакідаюць хвалёны сцяг «прыватнай уласнасці» і пераходзяць на рэльсы калектывізма, на рэльсы соцыялізма. Рушыцца апошняя надзея на аднаўленне капіталізма».

Гэты паварот сялянства на шлях калектывізацыі дазволіў нашай партыі і Ураду паставіць задачу пераходу ад палітыкі абмежавання кулацтва да новай палітыкі—да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класа, на аснове суцэльнай калектывізацыі. Пераадольваючы шалёнае супраціўленне кулакоў і іншых контррэволюцыйных элементаў у вёсцы, пераадольваючы супраціўленне ахвосця буржуазіі ў нашай краіне,—усіх гэтых трацкістаў, правых і іжэ з імі,—большэвіцкая партыя згуртавала працоўных вёскі пад сваім сцягам, пад сцягам совецкай улады, будаваўшай калгасы, не гледзячы на ўсё супраціўленне варожых элементаў і не гледзячы на небяспечныя вывіхі ўсякага роду «левых» перагібшчыкаў,—і атрымала слаўную перамогу. **(Бурныя апладысменты).** Паварот сялянства на шлях калгасаў у 1929—1930 гг. і канчатковая перамога калгаснага ладу ў нашай краіне, як і наступныя поспехі калгасаў, неразрыўна звязаны з іменем вялікага правадыра нашай партыі і народаў Совецкага Саюза—з іменем вялікага Сталіна. **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Воклічы «ура!»).**

Каб замацаваць свае перамогі, калгасы па-

вінны былі прайсці праз цяжкі перыяд рэарганізацыі сельскай гаспадаркі. Тры-чатыры годы патрэбавалася на тое, каб арганізацыя калгасаў у асноўным была закончана, каб асноўная маса сялянства канчаткова замацавалася ў калгасах. Пасля гэтага пачаўся паступовы і няўхільны ўздым сельскай гаспадаркі на аснове калгасаў, на аснове калгаснага ладу.

І вось цяпер, усяго праз 10 год, мы маем ужо канчаткова ўзмацнеўшыя калгасы і безраздзельна пануючую ў нашай краіне соцыялістычную сістэму сельскай гаспадаркі. Цяпер ужо ўся пасеўная плошча, за малым выключэннем, належыць калгасам і соўгасам. Менш поўпроцанта складаюць цяпер пасевы аднаасобных гаспадарак у нашай краіне. Наша сельская гаспадарка багата ўзброена новай тэхнікай, якой яна раней не ведала. Колькасць магутных трактараў у сельскай гаспадарцы перавышае поўмільёна штук. Гэтыя трактары выконваюць велізарную работу, ва многім аблягчаючы працу калгаснікаў. Колькасць камбайнаў дасягнула 165 тысяч. Камбайны павінны ў гэтым годзе ўбраць больш палавіны ўсёй пасеўнай плошчы зернавых культур. Колькасць грузавых аўтамабіляў перавышае 200 тысяч. У сельскай гаспадарцы многа таксама іншых патрэбных ёй машын, і з кожным годам расце магутнасць яе новай тэхнікі. Лік машына-трактарных станцый дасягнуў 6,5 тысячы. Гэтыя МТС выконваюць галоўную арганізатарскую работу ў справе ўздыму ўсёй калгаснай гаспадаркі. Лік соўгасаў дасягнуў амаль 4 тысяч, і сярод іх растуць рады ўзорных гаспадарак. Усё гэта дазваляе нам сказаць, што ў асноўным ужо завершана рэканструкцыя нашага земляробства на аснове новай сучаснай тэхнікі. **(Апладысменты).**

Аснашчэнне сучаснай тэхнікай у нашай сельскай гаспадарцы стаіць цяпер вышэй, чым у любой іншай краіне.

Стварыліся шматлікія кадры механікаў, трактарыстаў, камбайнераў, шофераў,—іх лік перавышае 1,5 мільёна чалавек. З гэтага асяроддзя і, асабліва, з асяроддзя трактарыстаў і камбайнераў вылучыліся ўжо многія знаўцы справы, якія далі выдатныя ўзоры стаханаўскай работы, і імёны лепшых сярод іх ведае ўвесь наш совецкі народ. **(Апладысменты).** Сотні тысяч і мільёны людзей з сялян ператварыліся за гэтыя годы ў вопытных арганізатараў буйнай грамадскай гаспадаркі ў калгасах, у калгасных звеннях і брыгадах. Гэтыя людзі імкліва авалодваюць перадавой сельскагаспадарчай культурай, сельскагаспадарчай навукай.

Усё гэта гаворыць за тое, што створаны спрыяючыя ўмовы для магутнага ўздыму сіл нашага земляробства і ўсёй сельскай гаспадаркі. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі перавысіла ўжо ў мінулым годзе ў паўтара раза валавую прадукцыю сельскай гаспадаркі ў 1930 годзе. Уздым ідзе ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі: па зярну і па бавоўне, па бураках і па ільну, па гародніне і па цытрусавых субтрапічных культурах. Пастаўленая нашай партыяй задача забяспечыць 7—8 мільярдаў пудоў ураджаю зярна паспяхова выконваецца.

Так і ў гэтым годзе пры добрай арганізацыі ўборкі мы маем поўную падставу разлічваць на збор 7 мільярдаў пудоў зярна. **(Апладысменты).** Гэта толькі адзін з прыкладаў таго, якімі буйнымі крокамі ідзе ўздым соцыялістычнага земляробства.

І ў галіне жывёлагадоўлі, дзе ў нас было найбольшае адставанне, мы маем за апошнія годы сур'ёзнае паляпшэнне. Апошняе рашэнне партыі і Урада аб уздыме жывёлагадоўлі адыграе ў гэтых адносінах важную ролю. Прынятыя гэтым рашэннем меры да ўздыму жывёлагадоўлі і да пераходу ад старой сістэмы да новай сістэмы мясапастаўвак, па колькасці наяўнай у калгасах зямлі, аблягчаюць становішча калгасаў, якія найбольш клапаціліся аб развіцці жывёлагадоўлі і разам з тым даюць штуршок да рашучага ўздыму жывёлагадоўлі ва ўсіх калгасах. Можна з упэўненасцю сказаць, што 1939 год значна рушыць уперад калгасную жывёлагадоўлю. **(Апладысменты).**

Прайшло ўсяго 10 год, як наша сялянства ў масе сваёй пачало будаваць калгасы. Цяпер мы маем 240 тысяч калгасаў, у якіх аб'еднана амаль усё сялянства нашай краіны. На нашых вачах ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі ідзе няўхільны ўздым соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, які ўвесь час расшыраецца.

Вызваленая ад пут капіталізма, узброеная перадавой тэхнікай, арганізаваная, як буйная грамадская вытворчасць, наша сельская гаспадарка расце і мацнее з кожным годам. Наша вёска канчаткова вызвалілася ад памешчыкаў і кулакоў, ад усякіх эксплаататараў. У нашай вёсцы няма больш і сялянскай беднаты, якая нядаўна яшчэ складала трэць сялянскай масы, а да рэволюцыі складала больш палавіны сялянства. Мы назаўсёды вызваліліся і ад гэтага спадарожніка старой, буржуазна-памешчыцкай дзяржавы. Сяляне-калгаснікі працуюць цяпер толькі для сябе саміх, для свайго благапалучча і шчасця. **(Апладысменты).** Для ўсіх сялян-калгаснікаў у нашай краіне адкрыт шлях да заможнага і культурнага жыцця. **(Апладысменты).** Ні ў адной іншай краіне, ніколі пры капіталізме, працоўныя сяляне не могуць аб гэтым і марыць.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка дае шматлікія доказы гэтаму паказам многіх тысяч жывых прыкладаў росту і ўмацавання нашых калгасаў і соўгасаў, паказам шматлікіх прыкладаў заможнага і культурнага жыцця калгаснікаў. Гэта выстаўка дае паказ пачаўшагася магутнага росквіту сіл усіх рэспублік, краёў і абласцей нашай вялікай краіны. Яна асвятляе яркім светам рост і ўздым усіх галін нашай сельскай гаспадаркі, уздым сельскагаспадарчых культур і розных відаў жывёлагадоўлі, поспехі машына-трактарных станцый і калгасаў, поспехі соўгасных і калгасных ферм, поспехі навуковых устаноў і асобных выдатных работнікаў сельскагаспадарчай навукі, поспехі і дасягненні асобных перадавікоў і знатных людзей нашай калгаснай вёскі. **(Апладысменты).**

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка арганізавана не па звычайных шаблонах. Тут не проста прадстаўлены тыя ці іншыя добрыя ўзоры работы, тыя ці іншыя ўзоры сельскагаспадарчай прадукцыі. Права ўдзелу на Сельскагаспадарчай выстаўцы вызначаецца точнымі навукова-абгрунтаванымі ўмовамі адбору кандыдатаў. Каб атрымаць права ўдзельнічаць на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, калгасы, соўгасы, машына-трактарныя станцыі, калгасныя і соўгасныя фермы, навукова-даследчыя ўстановы, селекцыйныя і вопытныя станцыі павінны мець пэўныя паказальнікі сваёй работы за апошнія два годы, а іменна—за 1937-1938 гг. Для кожнай сельскагаспадарчай культуры, па адпаведных зонах, устаноўлена пэўная вышыня ўраджайнасці, для кож-

яга віду жывёлагадоўчай гаспадаркі ўстаноўлены пэўныя паказальнікі вырошчвання маладняка і прадуктыўнасці, пры дасягненні якіх за апошнія два годы толькі і можна атрымаць права ўдзелу на Сельскагаспадарчай выстаўцы. Устаноўлены пэўныя паказальнікі добра арганізаванай работы МТС, а таксама ўстаноўлены паказальнікі работы за апошні 1938 год для перадавікоў сельскай гаспадаркі. Толькі пры дасягненні гэтых паказальнікаў калгасы, соўгасы і іншыя арганізацыі, а таксама асобныя перадавыя людзі сельскай гаспадаркі атрымалі магчымасць стаць удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і тады заносіліся ў Пачотную кнігу Выстаўкі. Устаноўліваючы гэтыя паказальнікі па ўзорах перадавых гаспадарак і па добрых узорах работы асобных знатных людзей калгаснай і соўгаснай гаспадаркі, мы выходзілі з таго, каб паставіць перад кожнай галіной сельскай гаспадаркі і перад кожнай групай работнікаў соцыялістычнага земляробства і тым самым перад усёй масай калгасаў і соўгасаў свае канкрэтныя задачы на бліжэйшы час. Мы кіраваліся пры гэтым тым, што гэта павінны быць такія паказальнікі, дасягненне якіх, у сярэднім, усёй масай калгасаў і соўгасаў азначала-б выкананне і нават перавыкананне заданняў трэцяга пяцігадовага плана па сельскай гаспадарцы. Гэта дае, разам з тым, магчымасць вызначыць, якая рэспубліка або вобласць ідзе ўперадзе, або, наадварот, адстае па таму ці іншаму віду сельскай гаспадаркі, у якой з іх вырашчана больш перадавых людзей сельскай гаспадаркі. У праграме паказальнікаў для Сельскагаспадарчай выстаўкі дана, такім чынам, праграма новага ўздыму сельскай гаспадаркі ў адпаведнасці з планам Трэцяй сталінскай пяцігодкі. **(Бурныя апладысменты).**

Чым хутчэй мы забяспечым выкананне ўсёй масай калгасаў і соўгасаў паказальнікаў, устаноўленых для ўдзельнікаў Сельскагаспадарчай выстаўкі, тым хутчэй мы забяспечым выкананне ўсяго плана трэцяй пяцігодкі па сельскай гаспадарцы. У гэтым значэнне Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, як арганізатара соцыялістычнага спаборніцтва за выкананне трэцяй пяцігодкі. **(Бурныя апладысменты).**

Адбор удзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі паказаў, што ў нас ужо не мала такіх калгасаў, соўгасаў, МТС, калгасных ферм, а таксама перадавікоў калгаснай і соўгаснай гаспадаркі, якія ідуць на ўзроўні патрабаванняў трэцяй пяцігодкі, а ва многіх выпадках ідуць і значна ўперадзе гэтых патрабаванняў. На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы атрымалі права ўдзельнічаць 15.059 калгасаў, 11.004 калгасныя фермы, 268 МТС, 795 соўгасаў. Апрача таго, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы атрымалі права ўдзельнічаць 155.821 чалавек з перадавікоў і знатных людзей сельскай гаспадаркі. **(Бурныя апладысменты).** Пры дасягненні добрых паказальнікаў работы за 1939 год, у будучым 1940 годзе ў Сельскагаспадарчай выстаўцы змогуць прыняць удзел новыя тысячы і тысячы калгасаў і соўгасаў, новыя дзесяткі тысяч перадавікоў сельскай гаспадаркі. Пажадаемжа, каб як мага шырэй разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж рэспублікамі, краямі, абласцямі і раёнамі, паміж калгасамі, МТС і соўгасамі за заваяванне права на ўдзел у Сельскагаспадарчай выстаўцы не толькі ў гэтым, але і ў 1940 годзе! **(Апладысменты).**

Па ўсіх галінах сельскагаспадарчых культур, па ўсіх галінах жывёлагадоўлі на гэтай Выстаўцы ёсць у натуры самыя выдатныя ўзоры і дасягненні, нярэдка перавышаючыя сусветныя рэкорды. Сіла калгаснага ладу дэманстрыруецца гэтай Выстаўкай з выключнай пераканаўчасцю, а тысячы яе ўзораў, прадстаўленыя тут усімі рэспублікамі, краямі і абласцямі, даюць уяўленне аб незлічоных багаццях сельскай гаспадаркі Совецкага Саюза, аб яго выключнай рознастайнасці, няўхільным уздыме і вялікіх творчых сілах. Наша Выстаўка не толькі дае вынік перамог, але і з'яўляецца магутным заклікам да далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі, да новых слаўных перамог соцыялізма. Дэманстрацыяй перамог калгаснага ладу мы дэманстрыруем вялікую сілу арганізацыі нашага новага совецкага калгаснага сялянства, самага шматлікага класа працоўных нашай краіны. Рабочы клас нашай краіны арганізован у магутную совецкую сілу, дзякуючы росту і няўхільнаму ўздыму буйнай соцыялістычнай індустрыі. Калгасы, ператварыўшыя наша сялянства з разрозненых і распыленых дробных гаспадароў у будаўнікоў грамадскай соцыялістычнай гаспадаркі, ператварылі совецкае калгаснае сялянства ў вялікую сілу, якая дэманстрыруе сёння велізарныя поспехі сваёй гаспадарчай арганізаванасці, культурнага росту і соцыялістычнай свядомасці. **(Апладысменты).** Такім чынам, дэманстрацыя калгасных перамог азначае велізарныя поспехі ў гаспадарчай і палітычнай арганізацыі ўсяго нашага народа. Спаяныя непарушнай дружбай, народы Совецкага Саюза прадстаўляюць нябачаную ў мінулым, немагчымую пры капіталізме вялікую, арганізаваную сілу. **(Апладысменты).** У гэтым—залог далейшых поспехаў комунізма ў нашай краіне. У гэтым—вялікае міжнароднае значэнне дэманстрацыі калгасных перамог.

Дазвольце ўсіх, хто сваёй прыкладнай работай забяспечыў сабе права ўдзелу на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, горача вітаць ад імені партыі і Урада. **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Воклічы «ура!»).** Дазвольце перадаць большэвіцкае прывітанне зачынальнікам справы будаўніцтва калгасаў і ўсім тым, хто цяпер вядзе няўхільную барацьбу за новыя і новыя поспехі калгасаў і соўгасаў. **(Бурныя апладысменты).**

Дазвольце віншаваць арганізатараў і будаўнікоў, архітэктараў і мастакоў, адказных кіраўнікоў і радавых работнікаў Выстаўкі, якія з поспехам выканалі сваю задачу. **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве пабеданоснае калгаснае сялянства Совецкага Саюза! **(Бурныя апладысменты. Воклічы «ура!»).**

Няхай жыве несакрушымы саюз рабочых і сялян, будуючых соцыялізм! **(Бурныя апладысменты. Воклічы «ура!»).**

Няхай жыве арганізатар нашых перамог—вялікая партыя Леніна—Сталіна! **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Воклічы «ура!»).**

Няхай жыве вялікі правадыр краіны калгасаў і соцыялізма таварыш Сталін! **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Воклічы «ура!»).**

Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі і Урада Совецкага Саюза аб'яўляю Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку адкрытай.

(Бурныя, працяглыя апладысменты, якія пераходзяць у авацыю. Воклічы—«Няхай жыве глава Совецкага Урада таварыш Молатаў! Ура! Таварышу Сталіну ура!»).

ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ
у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя советы дэпутатаў працоўных БССР

РАЗДЗЕЛ I

Выбарчая сістэма

АРТЫКУЛ 1. На падставе артыкула 109 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

АРТЫКУЛ 2. На падставе артыкула 110 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца ўсеагульнымі: усе грамадзяне БССР, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, вераспавядання, адукацыйнага цэнза, аседласці, соцыяльнага паходжання, маемаснага становішча і ранейшай дзейнасці, маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

АРТЫКУЛ 3. На падставе артыкула 111 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне ўдзельнічаюць у выбарах на роўных падставах.

АРТЫКУЛ 4. На падставе артыкула 112 Канстытуцыі БССР жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі наравні з мужчынамі.

АРТЫКУЛ 5. На падставе артыкула 113 Канстытуцыі БССР грамадзяне, якія знаходзяцца ў радах Чырвонай Арміі, карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі наравні з усімі грамадзянамі.

АРТЫКУЛ 6. На падставе артыкула 114 Канстытуцыі БССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца прамымі: выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца выбаршчыкамі непасрэдна шляхам прамых выбараў.

АРТЫКУЛ 7. На падставе артыкула 115 Канстытуцыі БССР галасаванне пры выбарах дэпутатаў у Советы дэпутатаў працоўных БССР з'яўляецца тайным.

АРТЫКУЛ 8. На падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР выбары ў Советы дэпутатаў працоўных БССР праводзяцца па выбарчых акругах.

Кожная выбарчая акруга пасылае ў адпаведны Совет дэпутатаў працоўных аднаго дэпутата.

АРТЫКУЛ 9. На падставе артыкула 18 Канстытуцыі БССР грамадзяне ўсіх іншых саюзных рэспублік карыстаюцца на тэрыторыі БССР выбарчымі правамі наравні з грамадзянамі БССР.

АРТЫКУЛ 10. Расходы, звязаныя з правядзеннем выбараў у Советы дэпутатаў працоўных БССР, робяцца за кошт дзяржавы.

РАЗДЗЕЛ II

Спісы выбаршчыкаў

АРТЫКУЛ 11. Спісы выбаршчыкаў складаюцца ў гарадах гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам—раённым Советам; у сельскіх мясцовасцях—сельскім Советам; у пасёлках—пасялковым Советам дэпутатаў працоўных. Форма спісаў выбаршчыкаў устанаўліваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

АРТЫКУЛ 12. У спісы выбаршчыкаў уключаюцца ўсе грамадзяне, якія маюць выбарчае права і пражываюць (пастаянна або часова) к моманту складання спісаў на тэрыторыі данага Совета, дасягнуўшыя к дню выбараў 18 год.

АРТЫКУЛ 13. Не ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў па судовых прыгаворах на працягу ўсяго ўстаноўленага ў прыгаворы тэрміну пазбаўлення выбарчых правоў, а таксама асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку страціўшымі розум.

АРТЫКУЛ 14. Ніхто з выбаршчыкаў не можа быць унесен больш, чым у адзін выбарчы спіс.

АРТЫКУЛ 15. Спісы выбаршчыкаў—агульныя для выбараў ва ўсе Советы дэпутатаў працоўных—складаюцца па кожнаму выбарчаму ўчастку ў алфавітным парадку з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, узросту, месца жыхарства выбаршчыка, а таксама нумароў выбарчых акруг па выбарах у адпаведны Совет дэпутатаў працоўных. Спісы выбаршчыкаў падпісваюцца старшынёю і сакратаром Совета дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 16. Спісы выбаршчыкаў, якія знаходзяцца ў воінскіх часцях і вайсковых злучэннях, складаюцца камандаваннем за подпісамі ка-

мандзіра і ваеннага камісара. Усе іншыя ваенна-служачыя ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў па месцу жыхарства адпаведнымі Советамі дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 17. Спісы выбаршчыкаў выбарчых участкаў, ствараемых пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях, і іншых лячэбных установах, складаюцца як на хворых грамадзян, так і на медыцынскі персанал, які знаходзіцца на дзяжурстве ў дзень выбараў.

У выбарах не могуць прымаць удзел хворыя, якія знаходзяцца ў скарлатынозных і дыфтэрыйных аддзяленнях.

АРТЫКУЛ 18. За 35 дзён да выбараў Совет дэпутатаў працоўных вывешвае спісы выбаршчыкаў для ўсеагульнага агляду або забяспечвае выбаршчыкам магчымасць азнаямляцца з гэтымі спісамі ў памяшканні Совета.

АРТЫКУЛ 19. Арыгінал спісаў выбаршчыкаў захоўваецца адпаведна ў Совеце дэпутатаў працоўных і воінскай часці або вайсковым злучэнні.

АРТЫКУЛ 20. Пры перамене выбаршчыкам месца свайго прабывання ў тэрмін паміж апублікаваннем спісу выбаршчыкаў і днём выбараў адпаведны Совет дэпутатаў працоўных выдае яму па форме, устаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР, «пасведчанне на права галасавання» і адзначае ў спісе выбаршчыкаў—«выбыў»; у пункце новага месца жыхарства—пастаяннага або часовага—выбаршчык уносіцца ў спіс выбаршчыкаў пры прад'яўленні пасведчання асобы, а таксама «пасведчання на права галасавання».

АРТЫКУЛ 21. Заява аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў (неўключэнне ў спіс, выключэнне са спісу, скажэнне прозвішча, імя, імя па бацьку, няправільнае ўключэнне ў спіс асоб, пазбаўленых выбарчых правоў) падаецца ў Совет дэпутатаў працоўных, які апублікаваў спіс.

АРТЫКУЛ 22. Выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан разгледзець кожную заяву аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў у трохдзённы тэрмін.

АРТЫКУЛ 23. Пасля разгляду заявы аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў, Выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан або ўнесці неабходныя выпраўленні ў спіс выбаршчыкаў, або выдаць заяўніцелю пісьмовую даведку аб матывах адхілення яго заявы; пры нязгодзе з рашэннем Совета дэпутатаў працоўных заяўніцель можа падаць скаргу ў Народны суд.

АРТЫКУЛ 24. Народны суд на працягу трох дзён абавязан у адкрытым судовым пасяджэнні з выклікам заяўніцеля і прадстаўніка Совета разгледзець скаргу на няправільнасць у спісе і сваё рашэнне неадкладна паведаміць як заяўніцелю, так і Совету. Рашэнне Народнага суда канчатковае.

РАЗДЗЕЛ III

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у абласныя советы дэпутатаў працоўных

АРТЫКУЛ 25. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у абласныя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца абласнымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР па выбарах у абласныя Советы дэпутатаў працоўных утвараюцца па наступных нормах:

Мінская вобласць	адна	акруга	на	15.000	чалавек	насельніцтва
Віцебская	„	„	„	15.000	„	„
Магілеўская	„	„	„	15.000	„	„
Гомельская	„	„	„	12.000	„	„
Палеская	„	„	„	11.000	„	„

АРТЫКУЛ 26. Спісы выбарчых акруг па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчым камітэтам абласнога Совета дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 27. У кожнай вобласці ўтвараецца Абласная выбарчая камісія па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 28. Абласныя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 8—10 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 29. Абласная выбарчая камісія:

а) наглядае на ўсёй тэрыторыі вобласці за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у абласны Совет дэпутатаў працоўных гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій і выносіць па скаргах канчатковыя рашэнні;

в) ізгатаўляе выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных;

г) рэгіструе выбраных дэпутатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных;

д) здае мандатнай камісіі абласнога Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

АРТЫКУЛ 30. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

АРТЫКУЛ 31. Акруговыя па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам абласнога Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 4—6 членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 32. Акруговая па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) устанаўлівае парадкавыя нумары выбарчых участкаў;

б) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных;

в) снабжае Ўчастковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

г) устанаўляе рэзультаты выбараў па акрузе;

д) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

е) прадстаўляе ў Абласную выбарчую камісію справаводства па выбарах.

РАЗДЗЕЛ IV

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у раённыя советы дэпутатаў працоўных

АРТЫКУЛ 33. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца раённымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

у раёне з насельніцтвам звыш 25 тысяч чалавек—адна выбарчая акруга на кожныя 1000 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 60 акруг;

у раёне з насельніцтвам да 25 тысяч чалавек утвараецца 25 выбарчых акруг.

АРТЫКУЛ 34. Спісы выбарчых акруг па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчымі камітэтамі раённых Советаў дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 35. У кожным раёне ствараецца Раённая выбарчая камісія па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 36. Раённыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчымі камітэтамі абласных Советаў дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 4—6 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 37. Раённая выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі раёна за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у раённы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

в) наглядае за своечасовым складаннем і давядзеннем да ўсеагульнага ведама спісаў выбаршчыкаў;

г) наглядае за своечасовай арганізацыяй выбарчых участкаў адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі Советаў дэпутатаў працоўных;

д) ізгатаўляе выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

е) рэгіструе выбраных дэпутатаў у раённы Совет дэпутатаў працоўных;

ж) здае мандатнай камісіі раённага Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

АРТЫКУЛ 38. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

АРТЫКУЛ 39. Акруговыя па выбарах у раённыя Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам раённага Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і двух-чатырох членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 40. Акруговая па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета дэпутатаў працоўных;

б) снабжае Ўчастковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

в) устанаўляе рэзультаты выбараў па акрузе;

г) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

д) прадстаўляе ў раённую выбарчую камісію справаводства па выбарах.

РАЗДЗЕЛ V

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у гарадскія і раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных

АРТЫКУЛ 41. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у гарадскія і раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца адпаведна гарадскім, раённым у гарадах Советам дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

у гарадах з насельніцтвам ад 12 да 100 тысяч чалавек—адна выбарчая акруга на кожныя 350 чалавек насельніцтва; у гарадах з насельніцтвам да 12 тысяч чалавек утвараецца 35 выбарчых акруг;

у гарадах Гомелі і Магілеве—адна выбарчая акруга на кожныя 400 чалавек насельніцтва;

у горадзе Віцебску—адна выбарчая акруга на кожныя 500 чалавек насельніцтва;

у горадзе Мінску—адна выбарчая акруга на кожныя 600 чалавек насельніцтва.

У гарадскіх раёнах з насельніцтвам звыш 20 тысяч чалавек утвараецца адна выбарчая акруга на кожныя 500 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 250 выбарчых акруг; у гарадскіх раёнах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек утвараецца 35 выбарчых акруг.

АРТЫКУЛ 42. Спісы выбарчых акруг па выбарах у гарадскія і раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчым камітэтам гарадскога, раённага ў гарадах Совета дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 43. У кожным горадзе і раёне ў гарадах ствараецца Гарадская, Раённая выбарчая камісія па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 44. Гарадскія і Раённыя ў гарадах выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца: Гарадская выбарчая камісія ў гарадах абласнога падпарадкавання—абласным Советам дэпутатаў працоўных, у гарадах раённага падпарадкавання—раённым Советам дэпутатаў працоўных; Раённая выбарчая камісія ў гарадах—гарадскім Советам дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 6—10 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў

АРТЫКУЛ 45. Гарадская, Раённая ў гарадах выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі горада і раёна за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у гарадскі, раённы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных;

в) наглядае за своечасовым складаннем і давядзеннем да ўсеагульнага ведама спісаў выбаршчыкаў;

г) наглядае за своечасовай арганізацыяй выбарчых участкаў адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі Советаў дэпутатаў працоўных;

д) ізгатаўляе выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у гарадскі, раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных;

е) рэгіструе выбраных дэпутатаў у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных;

ж) здае мандатнай камісіі гарадскога, раённага ў гарадах Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

АРТЫКУЛ 46. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая выбарчая камісія.

АРТЫКУЛ 47. Акруговыя па выбарах у гарадскія, раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца выканаўчым камітэтам гарадскога, раённага ў горадзе Совета дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2—4 членаў не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 48. Акруговая па выбарах у гарадскі, раённы ў горадзе Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты гарадскога, раённага ў горадзе Совета дэпутатаў працоўных;

б) снабжае Ўчастковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі па ўстаноўленай форме;

в) устанаўляе рэзультаты выбараў па акрузе;

г) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

д) прадстаўляе ў Гарадскую, Раённую ў горадзе выбарчую камісію справаводства па выбарах.

РАЗДЗЕЛ VI

Выбарчыя акругі і выбарчыя камісіі па выбарах у сельскія і пасялковыя советы дэпутатаў працоўных

АРТЫКУЛ 49. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзіцца сельскімі і пасялковымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Выбарчыя акругі на падставе артыкула 118 Канстытуцыі БССР утвараюцца па наступных нормах:

На тэрыторыі сельскіх Советаў і пасёлкаў з насельніцтвам звыш 1000 чалавек—адна выбарчая акруга на кожныя 100 чалавек насельніцтва, аднак, не больш 25 акруг; у сельсоветах і пасёлках з насельніцтвам да 1000 чалавек утвараецца 9 выбарчых акруг.

АРТЫКУЛ 50. Спісы выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца выканаўчымі камітэтамі сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 51. У кожным сельсавеце і пасёлку ствараецца Сельская, Пасялковая выбарчая камісія па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 52. Сельскія і Пасялковыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца раённымі Советамі дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2-4 членаў не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 53. Сельская, Пасялковая выбарчая камісія:

а) наглядае на тэрыторыі сельсавета і пасёлка за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў у сельскі, пасялковы Совет гэтага Палажэння аб выбарах;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні

выбарчых камісій па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных;

в) ізгатаўляе выбарчыя бюлетэні па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных і снабжае выбарчымі бюлетэнямі ўчастковыя выбарчыя камісіі;

г) рэгіструе выбраных дэпутатаў у сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных;

д) здае Мандатнай Камісіі сельскага, пасялковага Совета дэпутатаў працоўных справаводства па выбарах.

АРТЫКУЛ 54. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных ствараецца Акруговая па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія.

АРТЫКУЛ 55. Акруговыя па выбарах у сельскія пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца сельскім, пасялковым Советам дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, сакратара і аднаго члена камісіі не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 56. Акруговая па выбарах у сельскі, пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчая камісія:

а) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах кандыдатаў у дэпутаты сельскага, пасялковага Совета дэпутатаў працоўных;

б) устанаўляе рэзультаты выбараў па акрузе;

в) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні;

г) прадстаўляе ў Сельскую, Пасялковую выбарчую камісію справаводства па выбарах.

РАЗДЗЕЛ VII

Выбарчыя ўчасткі і Ўчастковыя выбарчыя камісіі

АРТЫКУЛ 57. Для прыёму выбарчых бюлетэняў і падліку галасоў тэрыторыя гарадоў, пасёлкаў і сельсоветаў падзяляецца на выбарчыя ўчасткі, агульныя для выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 58. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, у гарадах з раённым падзелам—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных, у сельскіх мясцовасцях і пасёлках—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 59. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца не пазней, чым за 50 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 60. Тэрыторыя сельсовета, які налічвае не больш 2000 насельніцтва, складае, як правіла, адзін выбарчы ўчастак; у кожным сяле, вёсцы і пасёлку, які налічвае ад 500, але не больш 2000 чалавек насельніцтва, арганізуецца асобны выбарчы ўчастак.

Тэрыторыя сельсовета і сельскага населенага пункта з насельніцтвам больш 2000 чалавек падзяляецца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1500—2500 чалавек насельніцтва.

У паселішчах або групе паселішч з насельніцтвам менш 500 чалавек, але не ніжэй 300 чалавек, у тых выпадках, калі адлегласць такіх паселішчаў да цэнтра выбарчага ўчастка перавышае 10 кілометраў, могуць быць утвораны асобныя выбарчыя ўчасткі.

У асобных раёнах Палескай вобласці, дзе пераважаюць дробныя паселішчы, выбарчыя ўчасткі могуць быць утвораны з насельніцтвам менш 300 чалавек, аднак, не ніжэй 100 чалавек.

АРТЫКУЛ 61. Гарады і пасёлкі, якія налічваюць больш 2000 чалавек насельніцтва, падзяляюцца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1500—2500 чалавек насельніцтва.

АРТЫКУЛ 62. Воінскія часці і вайсковыя злучэнні складаюць асобныя выбарчыя ўчасткі з колькасцю не менш 50 і не больш 1500 выбаршчыкаў.

АРТЫКУЛ 63. Пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях, дамах інвалідаў з колькасцю выбаршчыкаў не менш 50 утвараюцца асобныя выбарчыя ўчасткі.

У больніцах з некалькімі карпусамі дапускаецца ўтварэнне выбарчых участкаў пры асобных карпусах пры наяўнасці у кожным з іх не менш 50 выбаршчыкаў.

У больніцах і іншых лячэбных установах, дзе асобныя выбарчыя ўчасткі не арганізуюцца, дапускаецца прыём выбарчых бюлетэняў у самых больніцах і лячэбных установах выдзеленымі членамі выбарчых камісій. У гэтых выпадках больніцы снабжаюцца асобнымі выбарчымі скрынкамі.

АРТЫКУЛ 64. Судны з колькасцю выбаршчыкаў не менш 25, якія знаходзяцца ў плаванні ў дзень выбараў, могуць скласці асобныя выбарчыя ўчасткі, уваходзячыя ў выбарчыя акругі па месцу прыпіскі судна.

У выпадках, калі колькасць выбаршчыкаў на судне роўна норме насельніцтва для выбарчай акругі па выбарах у гарадскі або раённы ў гарадах Совет дэпутатаў працоўных, утвараецца асобная выбарчая акруга па выбарах у гарадскі або раённы Совет дэпутатаў працоўных па месцу прыпіскі судна.

АРТЫКУЛ 65. У кожным выбарчым участку ствараецца Ўчастковая выбарчая камісія, агульная па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 66. Участковыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях і пасёлках—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 6—10 членаў не пазней, чым за 45 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 67. Участковая выбарчая камісія:

а) праводзіць па выбарчаму ўчастку прыём выбарчых бюлетэняў;

б) праводзіць падлік галасоў па кожнаму кандыдату ў дэпутаты абласнага, раённага, гарадскога, сельскага і пасялко́вага Совета дэпутатаў працоўных;

в) перадае пратакол галасавання ў адпаведную акруговую выбарчую камісію, а ўсё справаводства—у гарадскі або раённы Совет дэпутатаў працоўных.

РАЗДЗЕЛ VIII

Парадак выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты

АРТЫКУЛ 68. На падставе артыкула 116 Канстытуцыі БССР кандыдаты пры выбарах выстаўляюцца па выбарчых акругах.

Права выстаўлення кандыдатаў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі і іншымі арганізацыямі, зарэгістраванымі ва ўстаноўленым законам парадку.

АРТЫКУЛ 69. Права выстаўлення кандыдатаў ажыццяўляюць як цэнтральныя органы грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, так і іх рэспубліканскія, абласныя і раённыя органы, таксама як агульныя сходы рабочых і служачых па прадпрыемствах і ўстановах, чырвонаармейцаў—па воінскіх часцях, а таксама агульныя сходы сялян—па калгасах, рабочых і служачых соўгасаў—па соўгасах.

АРТЫКУЛ 70. Кандыдаты ў дэпутаты не могуць быць членамі Акруговых, а таксама Ўчастковых выбарчых камісій той акругі, дзе яны выстаўлены кандыдатамі ў дэпутаты.

АРТЫКУЛ 71. Не пазней, чым за 35 дзён да выбараў, усе грамадскія арганізацыі або таварыствы працоўных, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты абласных і раённых Советаў дэпутатаў працоўных, абавязаны зарэгістраваць кандыдатаў у дэпутаты ў адпаведнай Акруговай выбарчай камісіі.

АРТЫКУЛ 72. Не пазней, чым за 20 дзён да выбараў усе грамадскія арганізацыі або таварыствы працоўных, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх Советаў, раённых Советаў у гарадах, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных, абавязаны зарэгістраваць кандыдатаў у дэпутаты ў адпаведнай Акруговай выбарчай камісіі.

АРТЫКУЛ 73. Акруговыя выбарчыя камісіі абавязаны зарэгістраваць усіх кандыдатаў у дэпутаты, выстаўленых грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і гэтага Палажэння аб выбарах.

АРТЫКУЛ 74. Грамадская арганізацыя або таварыства працоўных, якія вылучаюць кандыдата ў дэпутаты, абавязаны прадставіць у адпаведную Акруговую выбарчую камісію наступныя дакументы:

а) пратакол схода або пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, падпісаны членамі Прэзідыума з указаннем іх узросту, месца жыхарства, найменавання арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, указання аб месцы, часе і колькасці ўдзельнікаў схода або пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, прычым у пратаколе павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты, яго ўзрост, месцажыхарства, партыйнасць, занятак;

б) заява кандыдата ў дэпутаты аб яго згодзе балатыравацца па данай выбарчай акрузе ад выставіўшай яго арганізацыі.

АРТЫКУЛ 75. Кандыдат у дэпутаты Совета дэпутатаў працоўных можа галасавацца ў адзін і той-жа Совет толькі ў адной акрузе.

АРТЫКУЛ 76. Адмова Акруговай па выбарах у абласны, раённы, гарадскі, раённы ў гарадах, сельскі і пасялковы Совет дэпутатаў працоўных выбарчай камісіі ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты можа быць абскарджана ў двухдзённы тэрмін адпаведна ў Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію, рашэнне якой з'яўляецца канчатковым.

АРТЫКУЛ 77. Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, занятак, партыйнасць кожнага зарэгістраванага кандыдата ў дэпутаты абласнога і раённага Советаў дэпутатаў працоўных і найменаванне грамадскай арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, апублікоўваюцца адпаведнай Акруговай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 30 дзён да выбараў.

Даныя аб зарэгістраваных Акруговымі камісіямі кандыдатах у дэпутаты гарадскога, раённага ў гарадах, сельскага і пасялковага Советаў дэпутатаў працоўных апублікоўваюцца адпаведнай Гарадской, Раённай у гарадах, Сельскай і Пасялковай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 15 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 78. Усе зарэгістраваныя кандыдаты ў дэпутаты Советаў дэпутатаў працоўных падлягаюць абавязковаму ўключэнню ў выбарчыя бюлетэні.

АРТЫКУЛ 79. Акруговыя па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі, а таксама Сельскія і Пасялковыя выбарчыя камісіі абавязаны разаслаць усім Участковым выбарчым камісіям выбарчыя бюлетэні не пазней, чым за 10 дзён да выбараў.

АРТЫКУЛ 80. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца на мовах насельніцтва адпаведнай выбарчай акругі.

АРТЫКУЛ 81. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца па форме, устаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР, і ў колькасці, якая забяспечвае снабжэнне ўсіх выбаршчыкаў выбарчымі бюлетэнямі.

АРТЫКУЛ 82. Кожнай арганізацыі, выставіўшай кандыдата, зарэгістраванага ў адпаведнай выбарчай камісіі, таксама як кожнаму грамадзяніну БССР, забяспечваецца права бесперашкоднай агітацыі за гэтага кандыдата на сходах, у друку і іншымі спосабамі, згодна артыкула 100 Канстытуцыі БССР.

РАЗДЗЕЛ IX

Дзень выбараў

АРТЫКУЛ 83. Выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных праводзяцца на працягу аднаго дня—агульнага для БССР.

АРТЫКУЛ 84. Дзень выбараў устанаўляецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР не пазней, чым за два месяцы да тэрміна выбараў. Выбары праводзяцца ў нерабочы дзень.

АРТЫКУЛ 85. Штодзённа на працягу апошніх 15 дзён перад выбарамі Ўчастковая выбарчая камісія шырока апавяшчае выбаршчыкаў шляхам апублікавання або іншым спосабам аб дні выбараў і месцы выбараў.

РАЗДЗЕЛ X

Парадак галасавання

АРТЫКУЛ 86. Падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца ў дзень выбараў ад 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы па мясцоваму часу.

АРТЫКУЛ 87. У 6 гадзін раніцы ў дзень выбараў старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі ў прысутнасці яе членаў правярае выбарчыя скрынкі і наяўнасць складзенага па ўстаноўленай форме спісу выбаршчыкаў, пасля чаго закрывае і апячатвае скрынкі пячаткай камісіі і запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

Узоры пячатак і выбарчых скрынак устанаўляюцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

АРТЫКУЛ 88. Кожны выбаршчык галасуе асабіста, з'яўляючыся для гэтага ў памяшканне для галасавання, прычым падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца шляхам апускання ў выбарчую скрынку выбарчых бюлетэняў.

АРТЫКУЛ 89. У памяшканні для выбараў выдзяляецца для запаўнення бюлетэняў асобны пакой, у якім у часе галасавання забараняецца прысутнасць каго-б там ні было, у тым ліку і членаў Участковай выбарчай камісіі, апрача галасуючых; пры допуску ў пакой для запаўнення бюлетэняў адначасова некалькіх выбаршчыкаў, ён павінен быць абсталяван перагародкамі або шырмамі, па ліку дапускаемых адначасова выбаршчыкаў.

АРТЫКУЛ 90. Выбаршчык, які з'явіўся ў выбарчае памяшканне, прад'яўляе сакратару, або члену Ўчастковай выбарчай камісіі або пашпарт, або калгасную кніжку, або профсаюзны білет, або іншае пасведчанне асобы і пасля праверкі па спісу выбаршчыкаў і адзнакі ў спісе выбаршчыкаў атрымлівае выбарчыя бюлетэні ўстаноўленага ўзору.

АРТЫКУЛ 91. На асоб, якія з'явіліся ў памяшканне для выбараў з «пасведчаннем на права галасавання», згодна артыкула 20 гэтага Палажэння аб выбарах, Участковая выбарчая камісія вядзе асобны спіс, які прыкладаецца да спісу выбаршчыкаў.

АРТЫКУЛ 92. Выбаршчык у пакоі, адведзеным для запаўнення выбарчых бюлетэняў, пакідае ў кожным выбарчым бюлетэні прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе, выкрэсліваючы астатніх; пасля гэтага выбаршчык пераходзіць у пакой, дзе змяшчаецца Ўчастковая выбарчая камісія, і апускае выбарчыя бюлетэні ў выбарчую скрынку.

АРТЫКУЛ 93. Выбаршчыкі, якія не маюць магчымасці з прычыны непісьменнасці або якога-небудзь фізічнага недахопу самастойна запоўніць выбарчыя бюлетэні, маюць права запрасіць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога іншага выбаршчыка для запаўнення выбарчых бюлетэняў.

АРТЫКУЛ 94. Выбарная агітацыя ў выбарчым памяшканні ў часе падачы галасоў не дапускаецца.

АРТЫКУЛ 95. Адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні нясе старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі і яго распараджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

АРТЫКУЛ 96. У 12 гадзін ночы дня выбараў старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі аб'яўляе падачу галасоў закончанай і камісія прыступае да ўскрыцця выбарчых скрынак.

РАЗДЗЕЛ XI

Вызначэнне рэзультатаў выбараў

АРТЫКУЛ 97. У памяшканні, дзе Ўчастковая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, пры падліку галасоў маюць права прысутнічаць спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

АРТЫКУЛ 98. Участковая выбарчая камісія, ускрыўшы скрынкі, падлічвае бюлетэні па акругах, звярае лік паданых бюлетэняў, з лікам асоб, якія ўдзельнічалі ў галасаванні (на падставе адзнак у спісе выбаршчыкаў пры атрыманні бюлетэняў), і рэзультаты зверкі заносіць у пратаколы галасавання па кожнай выбарчай акрузе.

АРТЫКУЛ 99. Старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі аглашае ў прысутнасці ўсіх членаў Участковай выбарчай камісіі рэзультаты галасавання па кожнаму бюлетэню.

АРТЫКУЛ 100. Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні, у якіх пры галасаванні пакінута больш аднаго кандыдата, а таксама бюлетэні неўстаноўленага ўзору і колеру.

АРТЫКУЛ 101. Пры ўзнікненні сумненняў у сапраўднасці выбарчага бюлетэня пытанне вырашаецца Ўчастковай выбарчай камісіяй шляхам галасавання, што адзначаецца ў пратаколе.

АРТЫКУЛ 102. Участковая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме па кожнай выбарчай акрузе пратакол галасавання ў двух экземплярах, падпісваемых усімі членамі Ўчастковай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёю і сакратаром.

АРТЫКУЛ 103. У пратаколе галасавання Ўчастковай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) час пачатку і сканчэння падачы галасоў;

б) лік выбаршчыкаў па выбарчаму ўчастку і па акругах;

в) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па спісу выбаршчыкаў;

г) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па «пасведчаннях на права галасавання»;

д) лік паданых бюлетэняў па выбарчаму ўчастку і па акругах;

е) кароткае ізлажэнне заяў і скарг, паданых ва Ўчастковую выбарчую камісію і прынятыя Ўчастковай выбарчай камісіяй рашэнні;

ж) рэзультаты падліку галасоў па кожнаму кандыдату.

АРТЫКУЛ 104. Пасля сканчэння падліку галасоў і складання пратаколаў, старшыня Ўчастковай камісіі аглашае рэзультаты галасавання па кожнай акрузе ў прысутнасці ўсіх членаў камісіі.

АРТЫКУЛ 105. Адзін экземпляр пратакола галасавання, складзенага Ўчастковай выбарчай камісіяй, накіроўваецца з нарочным на працягу 24 гадзін у адпаведную Акруговую выбарчую камісію.

АРТЫКУЛ 106. Усе выбарчыя бюлетэні (асобна сапраўдныя і асобна прызнаныя несапраўднымі) павінны быць апячатаны пячаткай Участковай выбарчай камісіі і разам з другімі экземплярамі пратаколаў галасавання і пячаткай зданы старшынёю Ўчастковай выбарчай камісіі на захоўванне: у гарадах—гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам—раённым Советам дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях і пасёлках—раённым Советам дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 107. На Советы дэпутатаў працоўных ускладаецца абавязак захоўваць выбарчыя бюлетэні аж да зацвярджэння мандатаў дэпутатаў ад кожнай акругі адпаведным Советам дэпутатаў працоўных.

АРТЫКУЛ 108. Акруговыя па выбарах у абласны, раённы, гарадскі, раённы ў гарадах, сельскі і пасялковы Советы дэпутатаў працоўных выбарчыя камісіі ўстанаўляюць рэзультаты выбараў па акрузе на падставе пратаколаў, прадстаўленых участковымі выбарчымі камісіямі.

АРТЫКУЛ 109. У памяшканні, дзе Акруговая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, маюць права прысутнічаць пры падліку галасоў спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, таксама прадстаўнікі друку.

АРТЫКУЛ 110. Акруговая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР форме пратакол галасавання ў 2-х экземплярах, падпісваемых усімі членамі Акруговай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёй і сакратаром.

АРТЫКУЛ 111. У пратаколе Акруговай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) агульны лік выбаршчыкаў па акрузе;

б) агульны лік выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у галасаванні;

в) лік галасоў, паданых за кожнага кандыдата ў дэпутаты;

г) кароткае ізлажэнне заяў і скарг, паданых у Акруговую выбарчую камісію, і прынятыя Акруговай выбарчай камісіяй рашэнні.

АРТЫКУЛ 112. Пасяджэнні выбарчых камісій па выбарах у Советы дэпутатаў працоўных лічацца сапраўднымі, калі на іх удзельнічае больш паловы агульнага састава камісіі.

АРТЫКУЛ 113. Усе пытанні ў выбарчых камісіях вырашаюцца простай большасцю галасоў; пры роўнасці галасоў—голас старшыні дае перавагу.

АРТЫКУЛ 114. Не пазней 24 гадзін пасля сканчэння падліку галасоў старшыня Акруговай выбарчай камісіі абавязан пераслаць пратакол у запячатаным выглядзе праз нарочнага ў адпаведную Абласную, Раённую, Гарадскую, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію.

АРТЫКУЛ 115. Кандыдат у дэпутаты Совета дэпутатаў працоўных, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, г. зн. больш паловы ўсіх галасоў, паданых па акрузе і прызнаных сапраўднымі, лічыцца выбраным.

АРТЫКУЛ 116. Пасля падпісання пратакола Старшыня Акруговай выбарчай камісіі аглашае рэзультаты выбараў і выдае выбранаму кандыдату ў дэпутаты пасведчанне аб выбранні. Форма пасведчання аб выбранні ўстанаўляецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

АРТЫКУЛ 117. Калі ні адзін з кандыдатаў па акрузе не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, адпаведная Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асобна ў пратаколе і паведамляе ў Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую

ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію і адначасова абвяшчае перабалатыроўку двух кандыдатаў, атрымаўшых найбольшую колькасць галасоў, а таксама назначае дзень перабалатыроўкі не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін пасля сканчэння першага тура выбараў.

АРТЫКУЛ 118. Калі паданая колькасць галасоў па акрузе складае менш паловы выбаршчыкаў, маючых права галасаваць па гэтай акрузе, Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асобна ў пратаколе і паведамляе неадкладна ў вадцаведную Абласную, Раённую, Гарадскую, Раённую ў гарадах, Сельскую і Пасялковую выбарчую камісію, прычым у гэтым выпадку Абласная, Раённая, Гарадская, Раённая ў гарадах, Сельская і Пасялковая выбарчая камісія назначае новыя выбары не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін пасля першых выбараў.

АРТЫКУЛ 119. Перабалатыроўка кандыдатаў у дэпутаты, таксама як новыя выбары ўзамен прызнаных несапраўднымі, праводзяцца па спісах выбаршчыкаў, складзеных для першых выбараў, і ў поўнай адпаведнасці з гэтым Палажэннем аб выбарах.

РАЗДЗЕЛ XII

Адказнасць за парушэнне выбарчых правоў грамадзян

АРТЫКУЛ 120. Усякі, хто шляхам насілля, абману, пагроз або подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну БССР у ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Советы дэпутатаў працоўных БССР,—караецца пазбаўленнем свабоды на тэрмін да двух год.

АРТЫКУЛ 121. Службовая асоба Совета або член выбарчай камісіі, зрабіўшыя падробку выбарчых дакументаў або заведама няправільны падлік галасоў,—караюцца пазбаўленнем свабоды на тэрмін да трох год.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

27 ліпеня 1939 г.
г. Мінск.

12 К адкрыццю Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. На здымку: Знадворны выгляд павільёна Беларускай ССР.

З радасцю сустрэлі дэкрэт

Дэкрэт урада аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года) калектыў нашага завода «Большэвік» сустрэў з вялікай радасцю і ўздымам. На мітынгах, якія адбыліся па цэхах, зменах і агульназаводскім, усе рабочыя і работніцы аднадушна адобрылі дэкрэт. І тутжа пачалася падпіска.

Падпіска на новую пазыку з'яўляецца яшчэ адной дэманстрацыяй гарачай любві і адданасці шырокіх працоўных мас Совецкаму ўраду, вялікай партыі Леніна—Сталіна, нашаму роднаму і мудраму Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. Па ўсяму заводу, у прыватнасці ў хромава-аддзелачным цэху, падпіска прайшла паспяхова. Усе, як адзін, рабочыя падпісаліся на свой сярэднемесячны заработак.

Работніцы-стаханаўкі Валчок, Малашка заявілі аб тым, што яны падпісваюцца на пазыку ў размеры месячнай заработнай платы і ўпэўнены, што іх прыкладу паследуюць многія.

— Мы з радасцю падпісваемся,—заявілі яны,—бо ведаем, што гэта пазыка яшчэ больш умацуе магутнасць нашай радзімы, яе абароназдольнасць, дапаможа хутчэй выканаць асноўную гаспадарчую задачу Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі—дагнаць і перагнаць у эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя дзяржавы.

З такой радасцю, так актыўна ўсе работніцы і рабочыя падпісаліся на пазыку таму, што яны добра ведаюць, што іх сродкі пойдуць на карысць самога народа, на развіццё і росквіт соцыялістычнай культуры, на ўздым добрабыту працоўных краіны соцыялізма.

Дэкрэт аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (другога года) выклікаў сярод работніц новы вытворчы ўздым. Звыш 20 работніц першага хромавага цэха план перавыконваюць. Тт. Валчок і Малашка план выконваюць на 235 процантаў. Яны абавязаліся яшчэ лепш працаваць.

— Я — стаханаўка, — гаворыць тав. Хвашчэўская.—План значна перавыконваю, але пастараюся дабіцца яшчэ лепшых поспехаў у сваёй рабоце.

ВЕРЫГА—старшыня цэхкома першага хромавага цэха.

Мінск. Завод „Большэвік".

На здымку: Работніцы Мінскай швейнай фабрыкі „Октябрь" Бервінская, Лоева, Ларына, Кручынская і Архіпава падпісваюцца на пазыку. Падпіску праводзіць т. Балцэвіч.

Фота Салавейчыка.

ПАДПІСКА СЯРОД ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ

З маланкавай хуткасцю абляцела вестка аб выпуску Совецкім урадам Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года). Гэта радаснае паведамленне з вялікім захапленнем і энтузіязмам сустрэлі рабочыя, работніцы і хатнія гаспадыні Барысава.

1 жніўня адбыліся сходы і мітынгі ў кварталах Барысава. Тут жанчыны выступалі з прамовамі. У іх словах гучэла бязмежная любоў і адданасць радзіме, адданасць партыі Леніна—Сталіна.

— Я хачу, каб мае зберажэнні пайшлі на справу далейшага росту і перамог соцыялістычнага будаўніцтва,—хвалюючыся заявіла тав. Матросава.

Тт. Матросава і Хайкіна правялі вялікую работу сярод хатніх гаспадынь у кварткоме № 28. Рэзультаты гэтай работы ясна бачны. На 3 жніўня агульная сума падпіскі па кварткому дасягнула 2615 рублёў. 150 рублёў ужо ўнесены ў ашчадную касу наяўнымі грашыма.

Лепшыя падпісчыцы тут гэта хатнія гаспадыні тт: Пятрысця Л. К., Вішнёва, Рапапорт Э. З., Байф Соня. Гурэвіч Роза падпісалася на 30 рублёў і тут-жа ўнесла грошы. Таксама ўнеслі адразу грошы Ватнік, Левіна і іншыя.

Не горш ідзе падпіска на пазыку ў кварткоме № 22. Упаўнаважанай тут працуе тав. Карнюшка О. В. Яна ўдзяляе сур'ёзную ўвагу гэтай ганаровай рабоце, правяла ўжо некалькі сходаў і гутарак з хатнімі гаспадынямі ў сваім кварткоме.

Падпіска сярод хатніх гаспадынь Барысава з вялікім поспехам прадаўжаецца. Патрэбна адзначыць, што ў працоўных жанчын Барысава асабліва вялікая цяга да новай пазыкі. Па папярэдніх падліках яна будзе рэалізавана ў гэтым годзе на значна большую суму, чым у мінулым.

І. ЛЯНДРЭС.

Барысаў.

На карысць народа

Дэкрэт урада аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года) мы, калгасніцы калгаса «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна, сустрэлі з вялікай радасцю.

На адбыўшымся многалюдным мітынгу ўсе калгасніцы і калгаснікі, у колькасці 170 чалавек, падпісаліся на пазыку на суму 14 500 рублёў; у той-жа дзень унеслі наяўнымі грашыма 14 125 рублёў.

Партыя і ўрад клапоцяцца аб нас, калгасніках, ствараюць умовы для лепшага жыцця. Мы жывем у калгасе заможна. У мінулым годзе атрымалі на працадзень 1 кілограм збожжа, 9 кілограмаў бульбы і 6 рублёў грашыма. У гэтым годзе мы спадзяемся атрымаць яшчэ больш.

Мы з радасцю падпісаліся на пазыку па 100 рублёў кожная.

Калгасніцы з брыгады Гдалі Мухля,—Раіса Байрашэўская, Вінцынцына Байкоўская, Айша Мухля, Асэя Ждановіч, Ліма Палтаржыцкая падпісаліся таксама на 100 руб. кожная і амаль усе ўнеслі наяўныя грошы.

Аднадушнай падпіскай на пазыку пакажам усім нашым ворагам, што наш совецкі народ моцна згуртован вакол большэвіцкай партыі і любімага правадыра таварыша Сталіна.

Соф'я Абубікіна, Разаля Траянава, Юзефа Дзяруга.

Экіпаж ОЛЬГІ ПАПОВАЙ

Гэта быў пяты ці шосты па ліку ўзлёт курсанта Войтава. Ён прыкметна хваляваўся, падніма-ючыся ў паветра. Ольга Папова ведала слабыя бакі свайго вучня і старалася прывіць яму спакой.

— Вы ведаеце, Войтаў, я лічу кожны свой узлёт і патроху па-чынаю збівацца. Мне здаецца, што сёння спаўняецца тысяча гадзін прабывання ў паветры. Праўда, гэта не так ужо мала?

Яны гутарылі каля самалёта, чакаючы покуль тэхнік скон-чыць апошні агляд матора.

Папова ўселася першай і перавязала шлём скуранымі шну-рамі. Войтаў сеў у другой ка-біне. Папова наблізілася да перагаворнай трубкі і выразна, выдзяляючы кожнае слова, ска-зала:

— Войтаў, больш упэўне-насці! Уявіце, што вы ўзялі мяне ў паветра для прагулкі і ў мяне гэта першы палёт. Больш упэўненасці. Ну-ка да-вайце!

Войтаў усміхаецца. Словы гэ-тыя надаюць яму волю і жа-данне заслужыць пахвалу з вус-наў свайго настаўніка. Але вось усмешка збягае з твару, вучлёт робіцца сур'ёзным і сканцэнтра-ваным. Да дробязей успомніў-шы, што яму гаварыла Папова пры навучанні тэхніцы пад'ёму, ён упэўнена ідзе на ўзлёт.

Папова не спускае вачэй з люстэрка, сочыць за кожным рухам свайго вучня.—«Ён будзе лётчыкам»,—думае яна, задаво-леная энергічнымі дзеяннямі маладога пілота.

Аглядаючы прывычныя, бліз-кія і родныя, знаёмыя месцы— лясы, палянкі, срабрыстую рэчку здалёк, Ольга ўспамінала пача-так свайго лётнага жыцця, свой першы палёт.

Гэта было даўно, а здаецца толькі ўчора. Сямігодка скон-чана старанна. Яна першая з дзяўчат заявіла, што стане лётчыцай. Падругі не паверылі. Бацька адобрыў. Маці засмуці-лася. Хутка з невялікай стан-цыі Азёркі, Маскоўскай воб-ласці Олю праводзілі ў Разань, у авіяцыйную школу. Маці, атрымаўшы пісьмо ад Олечкі, праслязілася і пяць разоў пра-чытала яго голасна. «Мамачка, ужо лятаю, зусім не страшна. Адчуваю, што ў гэтым маё пры-званне і вельмі задаволена...»

Бацька моўчкі прачытаў пісь-мо і сказаў:

— Я і ведаў, што так будзе. Олюшка ў нас малайчына!

Тав. Папова.

А брат Дзмітрый тут-жа, на сямейным совеце, заявіў, што яму не падабае адставаць ад Олі і ён таксама едзе ў авіяцыйную школу. Так сям'я тэхніка Па-пова дала краіне двух лётчыкаў. Выдатна скончыўшы Разан-скую школу, Ольга пачала ма-рыць аб далейшай вучобе, аб машынах новых марак, аб службе ў баявой авіяцыі. І ў гэты час прышло прызначэнне ў Гомель.

Ёй сказалі, што асоавіяхімаў-скай авіяцыі патрэбны здоль-ныя педагогі, аэраклуб не ўкамплектаван, трэба ехаць.

— Трэба ехаць,—не раздум-ваючы паўтарыла яна гэтыя словы і ўжо праз некалькі дзён к 5 гадзінам раніцы спяшалася папасці на аэрадром, дзе неяк дыхалася інакш і вочы гарэлі больш ўзбуджана і сэрца білася часцей звычайнага. Мараку— мора, лётчыку—аэрадром, прас-торы.

За чатыры годы педагог-лёт-чык Папова дала радзіме 35 пі-лотаў, з якіх многія ходзяць зараз у ваеннай лётнай форме, а другія самі ўжо навучаюць моладзь лётнаму мастацтву ў асоавіяхімаўскіх клубах.

Оля рыхтуе пяты выпуск. Яна яшчэ ніколі не была так задаво-лена саставам сваёй групы, як цяпер. З 14 чалавек 9 амаль адначасова вылецелі ў сама-стойны палёт.

Усё гэта людзі выключных здольнасцей, адданыя совецкай авіяцыі, гатовыя для яе на ўсё.

Оля несумненна права, сцвяр-джаючы, што лётнаму майстэр-ству трэба вучыцца доўга і чым раней пачынаеш сваё ўдасканаленне, тым лепш, тым больш магчымасцей упэрадзе. Экіпаж Ольгі ў Гомельскім аэраклубе самы дружны і ва ўсіх адноси-нах самы перадавы.

Нават са знадворнага боку самалёт, на якім Ольга Папова навучае сваіх пітомцаў, адрозні-ваецца ад другіх. Машына бліш-чыць, заўсёды ў парадку. За чатыры годы ў Ольгі не было выпадка, каб яе крыла-тая птушка адмовіла ў паветры. Раз толькі, на вышыні 80 мет-раў, застопарыў матор, упера-дзе прасціралася вёска і пасадка на калгасныя дамы здавалася немінучай, але лётчыца не стра-ціла самаўладання і майстэрскі села за ваколіцай.

Вось адзінае, што з ёй было ў паветры, і нават гэты непрад-бачаны выпадак яна змагла ска-рыстаць у сваёй педагагічнай практыцы, часта напамінаючы сваім вучням аб вытрымцы, ха-лоднакроўі, стойкасці. Усімі гэ-тымі якасцямі павінен у поўнай меры аўладаць пілот. І гэтыя якасці Папова прывівае сваім выхаванцам.

... Высока над лесам, купаючыся ў праменнях летняга сонца, па-рыць самалёт. Ён то ўзнімаецца ў вышыню, то апускаецца ніжэй. Сонечныя праменні амываюць яго крыллі. Роўнамерна стукае матор, гудзіць нястомны прапе-лер. Самалёт вядзе дзяўчына-лётчык Оля Папова.

Е. САДОЎСКІ.

СТРАЛОК, ПАРАШУТЫСТКА, ЛЕТЧЫК

Яшчэ ў дзяцінстве Дар'я адрознівалася ад сваіх падруг незвычайнай смеласцю, настойлівасцю і ўдумлівасцю. Будучы падросткам, яна ў вёсцы пасвіла жывёлу, гаспадарыла ў доме і працавала ў полі.

У 1931 годзе, пятнаццацігадовая Дар'я Слесарава паступіла ў Віцебскі фабзавуч панчошнікаў. Ёй падабаўся малады і дзёрзкі калектыў фабзавучнікаў. За скромнасць, за актыўны ўдзел у грамадскай рабоце палюбілі і рэбяты Дар'ю. Часамі над ёй жартавалі і гаварылі:

— Па сіле і прозвішчу табе-б, Дора, слесарам быць, а ты панчошніцай уздумала стаць.

— Кожная спецыяльнасць безумоўна неабходна ў краіне,— разважала Слесарава.—Аднак, калі мяняць прафесію, то абавязкова буду лётчыкам. Гэта справа патрэбная ў любы час, як у мірны, так і ў ваенны.

Але паехаць вучыцца ў лётную школу ў той час Дар'і не прадстаўлялася магчымасці, неабходна была граматнасць. Яна прадаўжала вучыцца ў фабзавучы, актыўна ўдзельнічаючы ў абаронна-масавай рабоце.

Са зборшчыка членскіх узносаў і старшыні пярвічнай арганізацыі Асоавіяхіма ў фабзавучы Дар'я Слесарава вырасла ў інструктара стралковага спорта. Без адрыву ад вытворчасці яна скончыла перасоўную школу грамадскіх інструктароў па стральбе з дробнакалібернай зброі. Потым скончыла рэспубліканскую стралковую школу— стала снайперам меткага агню. Дзесяткі і сотні рабочых і работніц буйнейшай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» ў горадзе Віцебску навучыліся ў комсамолкі Слесаравай стралковай справе. Не адну сотню варашылаўскіх стралкоў падрыхтавала яна. Хто з совецкай моладзі не марыць стаць добрым стралком, кавалерыстам, матацыклістам, танкістам, парашутыстам, спартсменам? Асабліва моладзь вабіць авалодаць авіясправай. Слесарава з'яўляецца адной з тых, якія прагна імкнуліся і імкнуцца быць гордымі сокаламі Краіны Советаў.

Наша партыя, лепшы друг і настаўнік совецкай моладзі таварыш Сталін стварылі такія ўмовы ў краіне, што кожны юнак, дзяўчына могуць ажыццявіць свае мары.

Некалькі год назад у горадзе Віцебску быў арганізаван аэраклуб. Без адрыву ад вытворчасці акуратна наведвала Дар'я Слесарава заняткі па вывучэнню лётнай і парашутнай справы. Праз некаторы час яна скончыла школу.

Колькі было радасці, калі яна ўпершыню паднялася ў паветра. Назаўсёды застаўся ў яе памяці і першы прыжок з парашутам.

— Самалёт набраў вышыню 600 метраў,—успамінае яна.— Унізе, на аэрадроме мітусіліся людзі. Яны здаваліся зусім маленькімі. Я адарвалася ад самалёта і павісла ў паветры. Плаўна плыла пад блакітным купалам парашута. Сэрца моцна білася не то ад радасці, не то ад хвалявання... Пасля гэтага я пачала ўзмоцнена трэніравацца.

Праз некаторы час Дар'я Слесарава паехала вучыцца ў Маскву. Яна з поспехам скончыла школу і атрымала званне інструктара першай катэгорыі па парашутызму. Набытыя веды яна перадае моладзі, вучыць маладых патрыётаў парашутызму— захапляючаму віду спорта.

Працуючы інструктарам парашутнага спорта, Дар'я Слесарава адначасова прайшла праграму інструктара-лётчыка пры Бабруйскім аэраклубе. Зараз Слесарава дасканала ўладае трыма ваеннымі спецыяльнасцямі — стралка, парашутыстка і інструктара-лётчыка.

У гэтым годзе тав. Слесарава рыхтуе для краіны 13 пілотаў. Яна адна з лепшых інструктароў лётчыкаў Асоавіяхімаўскай авіяцыі. У спаборніцтве паміж экіпажамі самалётаў і аэраклубаў Беларусі, яе экіпаж займае адно з першых месц. Першай у рэспубліцы выпусціла тав. Слесарава сваіх вучлётаў на самастойныя палёты. Яны выдатна выконваюць задачы па тэхніцы пілатыравання.

Экіпаж тав. Слесаравай у спаборніцтве ўнутры клуба заваяваў пераходны чырвоны сцяг. У яе-ж групе знаходзіцца і пераходны чырвоны сцяг ЦК ЛКСМБ і ЦС Асоавіяхіма Беларусі.

Самалёт Дар'і Слесаравай працуе без аварый і здарэнняў. Вучлёты экіпажа яе ганарацца сваім інструктарам-лётчыкам. Тав. Слесарава вучыць сваіх вучлётаў любіць лётную справу.

Нядаўна Слесараву прынялі ў кандыдаты ВКП(б). — Прыналежнасць да партыі Леніна— Сталіна абавязвае мяне яшчэ лепш працаваць,—гаворыць яна.

І. ПЕТРУША.

Авіяцыя на службе надвор'я.
На здымку: Дзяжурны тэхнік-аэролаг З. В. Тонкава пасля звароту з вышатнага палёту правярае апаратуру. Фота Чэрнова (Фотахроніка ТАСС).

УЗНЯЛАСЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Клапоцячыся аб умацаванні калгаснага ладу і ўзняцці магутнасці калгасаў партыя і Совецкі Урад выдалі пастанову «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Гэты выдатны дакумент горача віталі, аднадушна прынялі ўсе калгаснікі нашага калгаса. На агульным сходзе мы зацвердзілі правілы ўнутранага распарадку, абавязкі кожнага калгасніка.

Калгасніцы, якія раней зусім не выходзілі на работу, зараз актыўна працуюць. Многія калгасніцы з'яўляюцца мацерамі малых дзяцей. Каб стварыць ім спрыяючыя ўмовы для работы, мы арганізавалі дзіцячыя яслі, якія добра абсталявалі, а таксама матэрыяльна забяспечылі. Каля 40 дзяцей штодзённа наведвае яслі.

Жаночыя звенні ідуць упарадзе, працуюць вельмі добра, а вось сярод мужчынскіх не зусім ладзіцца, то спазненне бывае, а то і невыкананне норм. Я пачала больш уважліва прыглядацца і аказалася, што ўсю работу падрываў адзін калгаснік, а зараз ён ужо не калгаснік—Васіль Баравік. Ён дэзарганізаваў масы.

Я некалькі разоў з ім гутарыла, растлумачвала наколькі шкодны для калгаса яго ўчынкі. Не дапамагло. Тады выклікалі яго на праўленне раз, другі, трэці, аштрафавалі. Гэта таксама не дапамагло. Прышлося выключыць Баравіка з калгаса. Зараз працоўная дысцыпліна наладзілася.

У часе ўборачнай кампаніі людзі працавалі добра. Сенаўборка прайшла паспяхова. Калгас ужо разлічыўся з дзяржавай па сенапастаўках. Выкананне зернапастаўак мы арганізавалі адначасова з уборкай. Калі пачалі жаць, адразу пусцілі ручную малацілку і два звяны загатаўлялі добраякаснае зярно для дзяржавы.

Моцная працоўная дысцыпліна ёсць пярвейшы залог таго, што калгасы стануць большэвіцкімі, а калгаснікі—заможнымі.

ЯКАЎЛЕВА—дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, старшыня калгаса.

Крупкі, калгас „Чырвоны Май".

Дэпутат Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, студэнтка Беларускага калгаснага сельскагаспадарчага тэхнікума імені Леніна Юлія Пятроўна Маленок праводзіць летнія канікулы ў родным калгасе „Пролетарый" (Хойніцкі раён, Палеская вобласць). Яна сістэматычна праводзіць масавую работу сярод насельніцтва.

На здымку: Ю. П. Маленок (другая злева) ў часе абедзенага перапынка праводзіць палітінфармацыю для маладых калгасніц.

Фота Б. І. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

ПА-СТАХАНАЎСКІ ЎБІРАЕМ УРАДЖАЙ

Уборка ў гэтым годзе праходзіла ў нашым калгасе паспяхова, арганізавана. Мы зараней яшчэ падрыхтаваліся да сустрэчы багатага ўраджаю. Я, як адказная за лён, прадумала план уборкі, намеціла як расставіць рабочую сілу, што зрабіць для таго, каб усе жанчыны выходзілі на работу.

Каб лепш арганізаваць працу, усіх жанчын разбілі на звенні. У маім звяне 8 жанчын. Пад паказальны ўчастак мы ўзялі два гектары. Па абавязацельству мы павінны атрымаць з кожнага гектара не менш 8 цэнтнераў ільнонасення і 10 цэнтнераў ільновалакна. Ураджай добры. Безумоўна абавязацельства выканаем.

Зараз у калгасе ўборка арганізавана амаль кругласутачна. Лён выбіралі раніцой, а таксама позна ўвечары. Гэта для таго, каб не асыпаліся галоўкі і не было страт. За чатыры дні выцерабілі плошчу ільну ў 40 гектараў.

На ўборку вышлі ўсе жанчыны, нават тыя, якія раней ніколі не працавалі ў калгасе. Праўда з асобнымі прыходзілася гутарыць па некалькі разоў, растлумачваць, быць у іх на кватэрах. Хадося Камянок, Ганна Шчэбянок лічыліся калгаснікамі толькі на паперы. Ні аднаго працадня не выпрацавалі ў полі, на сваіх прысядзібных участках працавалі з рання да вечара, а цяпер у часе ўборачнай штодзённа выходзяць на работу. Суклета Саранчук працавала ў калгасе з перарывамі. Дзень выйдзе, а два—дома, і так на працягу некалькіх год. У гэтым годзе Суклета Саранчук з'яўляецца стаханаўкай.

Лік стаханаўцаў у калгасе ўзрос. Такі вытворчы ўздым сярод калгаснікаў выклікала пастанова партыі і Урада «Аб мерах аховы грамадскіх зямель ад разбазарвання», якая з'яўляецца яркім сведчаннем вялікіх Сталінскіх клопатаў аб калгасным сялянстве, накіравана на далейшае яшчэ большае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

За высокія паказальнікі, дасягнутыя па ільну ў мінулыя некалькі год падрад я ўдастоілася вялікага гонару быць удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Зараз мы змагаемся за тое, каб усе майстры ільнаводства, а таксама і калгас у цэлым былі ўдзельнікамі ў выстаўцы 1940 года.

М. САРАНЧУК—дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Рэчыцкі раён, калгас „Пабеда".

Инв. 1953 г. 64663

Як зварыць варэнне

Для ўсіх сартоў варэння трэба браць толькі спелыя і не пацёртыя ягады. У часе варкі не трэба мяшаць варэнне лыжкай; дастаткова час ад часу ўстрасануць таз. Варыць у медным тазу і не знімаць пенкі да гатоўнасці. Пенку знімаць добра і асцярожна, не прымінаючы ягады. Вызначыць гатоўнасць варэння можна наступным чынам:

1. Узяць стакан халоднай вады, апусціць у яго з лыжкі некалькі кропель сіропа. Варэнне гатова, калі кропля тоне адразу, не распускаючыся ў вадзе.

2. Наліць на сподак трохі сіропа, астудзіць яго. Варэнне гатова, калі пры нахіле сподка на паверхні будзе зыб.

3. Апусціць лыжку ў сіроп, вынуць яе не захопліваючы сіропа, трымаць у вертыкальным становішчы. Варэнне гатова, калі з лыжкі павольна ўпадуць тры-чатыры кроплі сіропа. Калі варэнне вадкае, то кроплі сіропа хутка сцякуць з лыжкі.

Гатовае варэнне перакласці ў зусім чыстую і сухую пасуду, захоўваць у сухім і прахладным месцы.

Калі варэнне пераварана, то яно хутка зацукроўваецца. У банку з зацукраваным варэннем трэба ўліць палову стакана гатаванай вады, завязаць і паставіць на нач у цёплую печку. Калі варэнне не распусціцца,— паставіць у печку другі раз.

Калі варэнне пачало кіснуць, трэба выліць яго ў таз, прыбавіць стакан цукровага пяску (вады дабаўляць не трэба), некалькі разоў ускіпяціць і зняць пенку.

Варэнне з сліў

Вымыць 3 кілограмы сліў. Каб ягады не развальваліся, накалоць іх тонкай з завостраным канцом драўлянай палачкай. Узяць 3 кілограмы цукровага пяску і 2 стаканы вады. Ускіпяціць. Палажыць слівы.

Можна варыць слівы і без костачак; тады ягады накалваць не трэба.

Варэнне з бруснiц

1 кілограм брусніц, 1 кілограм цукру, 1 палачка карыцы.

Брусніцы перабраць, заліць халоднай вадой і паставіць на суткі, потым адкінуць на рэшата. Палажыць брусніцы ў кіпяток і зноў адкінуць. Палажыць у таз цукар, заліць паловай стакана вады, зварыць сіроп і палажыць карыцу, потым засыпаць ягады. Калі з'явіцца пена, знімаць яе лыжкай, устрасаючы таз.

Варэнне з брусніц можна рабіць з яблыкамі. На 1 кілограм брусніц узяць 1 кілограм салодкіх яблык і 2 кілограмы цукру. Брусніцы варыць так, як указана вышэй. Яблыкі ачысціць, нарэзаць тоненькімі лустачкамі і класці іх тады, калі ўжо брусніцы паварацца.

Грыбы марынаваныя

Калі грыбы марынаваць на зіму, то трэба іх падрыхтаваць так. Белыя грыбы ці рыжыкі ачысціць ад зямлі, добра вымыць, зварыць у салонай вадзе, адкінуць на рэшата. Асобна прыгатаваць марынад. Для гэтага пракіпяціць моцны ўксус, паклаўшы ў яго лаўровага лісту, гваздзікі, перцу, пахучага і горкага (гарошкам), і трохі цукру. Калі ўксус добра пракіпіць, даць астынуць і заліць ім адвараныя грыбы. Скласці ў банку, завязаць добра (пад паперу палажыць кавалак тканіны), каб не праходзіла паветра.

Грыбы можна не адварваць асобна ў салонай вадзе, а адразу варыць у ўксусе, з пакладзенымі ў яго спецыямі, прыбавіўшы солі. Але замарынаваныя такім чынам грыбы доўга стаяць не могуць.

Шынкаваная капуста

Ачышчаную ад верхніх лісцяў капусту шынкуюць і ўкладаюць у бочкі, усцілаючы дно і сценкі бочкі верхнімі лістамі капусты. Асобныя слаі капусты злёгку ўтрамбоўваюць, пасыпаюць невялікай горсцю солі, паміж слаямі капусты кладуць кмен, лустачкі морквы, яблыкі, брусніцы або журавіны. На працягу першай дэкады трэба драўлянай палкай рабіць невялікія дзіркі ў капусце, каб даць выхад стварыўшымся газам.

Бочкі з капустай ставяць у халодным месцы і пакрыўшы зверху капусным лістом, накрываюць драўляным кружком-накрыўкай, а зверху кладуць камень. Бочкі павінны быць зусім чыстыя. На 75 кілограмаў капусты солі ўжываюць каля 1 кілограма.

Инв. 1953 к. 64663

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058; 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 865. Тыраж 12.425 экз. Уп. Галоўліта БССР № 502.
Здана ў друк. 4/VIII—39 г. Падпісана да друку 21/VIII—39 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знак.

Да гэтага нумара бясплатна дадаецца ўкладка-выкрайка.

КУПЛЯ ЛОМУ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ

праводзіцца ларкамі „ВТОРЦВЕТМЕТ“

У МІНСКУ—НА СУРАЖСКІМ РЫНКУ; У ВІЦЕБСКУ—АРШАНСКАЕ ШАСЕ, 76; У ГОМЕЛІ—ПАЛЕСКАЯ 2
І ВА ЎСІХ НАСЕЛЕНЫХ МЯСЦОВАСЦЯХ ЗАГОТПУНКТАМІ САЮЗУЦІЛЯ, ПРОМУЦІЛЬСАЮЗА
І СІСТЭМЫ СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ.

ЗА ПРАДАНЫ ЛОМ ПАТРАБУЙЦЕ АПЛАТУ ПА НОВЫХ ЦЭНАХ:

а)	лом чырвонай медзі	2 р. 15 к.	за кгр.	д) лом алюмінія	2 р. 15 к. за кгр.
б)	„ латуні і тампака	1 р. 60 к.	„ „	е) „ цынка	— 65 к. „ „
в)	„ бронзы	2 р. 90 к.	„ „	ж) „ свінца	— 65 к. „ „
г)	„ мельхіёра	1 р. 90 к.	„ „	з) „ бабіта	1 р. 20 к. „ „

ЗАГАТОЎКУ ЛОМУ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ АД ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ПРАВОДЗЯЦЬ УПАЎНАВАЖАНЫЯ БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ „ВТОРЦВЕТМЕТ“ па ўсёй Беларусі. МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ ЎПАЎНАВАЖАНЫХ: У МІНСКУ—вул. ТАЛСТОГА, № 31/27; У ВІЦЕБСКУ—РЫЧАЖНАЯ, 23; У ГОМЕЛІ—РАГАЧОЎСКАЯ, 3; У БАБРУЙСКУ—ЦІТАЎКА, ЖЛОБІНСКАЯ, 18; У БАРЫСАВЕ—вул. 3 ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА, 13; У ОРШЫ—ВУЛ. КІРАВА, 12 і ў МАГІЛЕВЕ—ВУЛ. ГРОМАВА, 7.

АДРАС КАНТОРЫ БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ „ВТОРЦВЕТМЕТ“,—Г. МІНСК, СОВЕЦКАЯ, 50.
ТЭЛЕФОН 24-354. РАЗЛІКОВЫ РАХУНАК № 174001 У БЕЛКАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКА.

БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ „ВТОРЦВЕТМЕТ“.